# Адкрыць — і захапіцца

**У сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" з 14 лістапада па 13 снежня экспануюцца работы лаўрэатаў і стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. Прадстаўлены 105 твораў — жывапіс, графіка, скульптура, дызайн, фатаграфія, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Іх аўтарам — ад 7 да 31 года.**

Паўдзельнічаць у гэтай традыцыйнай Рэспубліканскай мастацкай выстаўцы было столькі ахвочых, што ўпершыню за 10 гадоў яе правядзення ўтварылася конкурсная сітуацыя. Арганізатарам (а гэта Міністэрства культуры краіны, спецыяльны фонд Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, БДУ культуры і мастацтваў) рабіць адбор было нялёгка. У выніку экспазіцыя атрымалася як ніколі разнастайная, маштабная (летась было прадстаўлена 80 работ), па-мастацку ўражлівая.

На вернісажы выступілі рэктар БДУКіМ Барыс Святлоў, міністр культуры Уладзімір Матвейчук, старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Наталля Аўдзеева і старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў Алена Бялова, прарэктар па навуковай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхал Баразна. Выступоўцы гаварылі пра тое, што гэты праект, у якім удзельнічае адораная і перспектыўная творчая моладзь з усіх рэгіёнаў, заахвочаная спецыяльным фондам, — яшчэ адно пацвярджэнне ўвагі дзяржавы да будучыні культуры нашай краіны. Самі работы, выстаўленыя ў галерэі, сведчаць: будучыня ў нашага мастацтва годная. Органы культуры і адукацыі імкнуцца разам рабіць агульную справу: шукаць таленавітых дзяцей, забяспечваць ім умовы для спецыяльнай адукацыі, творчага развіцця, прафесійнага ўдасканалення. Штогод ад 300 да 400 таленавітых дзяцей, маладых творцаў заахвочваюцца фондам, і сёння іх ужо дзве з паловай тысячы чалавек. Дзяржава зацікаўленая цяпер і ў тым, каб стварыць маладым прафесіяналам годныя ўмовы для далейшай працы, каб яны адчувалі сваю запатрабаванасць на радзіме і сваім талентам спрыялі росквіту яе культуры.



Як вядома, спецыяльны фонд Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі апякуе і музыкантаў. На вернісаж былі запрошаны і яны: вельмі арганічна ўспрымалася ў мастацкім асяродку гучанне струннага квартэта Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (кіраўнік Андрэй Варламаў). Наведнікі слухалі яркую натхнёную ігру і няспешна шпацыравалі па галерэі. Затрымліваліся ля радасных работ Дзяніса Іванова, ля такіх розных і ўдумлівых жывапісных сюжэтаў Алесі Скарабагатай, ля выбітных скульптур Дзмітрыя Комлева, Кацярыны Навіцкай, Вольгі Высоцкай, ля саламянай "Дамы з парасонам" Алены Ляшнеўскай. Дзівіліся на дэкаратыўна-сакавітыя вобразы Наталлі Захаравай, замілоўваліся малюнкамі сямігадовай Ады Нафанавай, падсілкоўваліся жыццядайным зялёным святлом рамантычнага палатна Веры Асядоўскай "Квітнеючы ставок".

З юнымі талентамі суседнічаюць тыя, хто ўжо неаднойчы вылучаўся на міжнародным узроўні, перамагаў на Дэльфійскіх гульнях. І, вядома ж, нябачна прысутнічаюць майстры-настаўнікі, у тым ліку і заахвочаныя ў свой час Прэзідэнцкім фондам.

Да вернісажа выпусцілі маляўнічы каталог, у якім замест звыклай анатацыі змешчана прывітальнае слова заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі прафесара Уладзіміра Зінкевіча: "... Талент — гэта асаблівая адказнасць, асаблівая годнасць. Ён абавязвае быць адкрытым свету, сур'ёзна ставіцца да сябе, захоўваць цэласнасць і гармонію, навучыцца цаніць жыццё, умець за вялікай колькасцю спраў і несканчонай плынню інфармацыі чуць сваё сэрца..." Сапраўды, талент абавязвае да асаблівай адказнасці не толькі таго, каму ён падараваны звыш, але і таго, хто знаходзіцца побач з маладым творцам. Як гэта важна: угледзець талент, захапіцца ім і падтрымаць, заахвоціць, памагчы раскрыцца, каб яго ўбачылі і адкрылі для сябе іншыя, а з часам — убачыў бы і захапіўся вялікі мастацкі свет.

**Лана ІВАНОВА**

***На здымку:** міністр культуры У. Матвейчук, старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі Н. Аўдзеева і рэктар БДАМ Р. Смольскі гутараць з пераможцам Дэльфійскіх гульняў Д. Івановым.*

*Фота Віктара Кавалёва*